# РАЗДЗЕЛ 4. КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ЯК БАЗІС ДЛЯ ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

Ірына Лапцёнак

прарэктар па вучэбнай рабоце ДУА «Інстытут культуры Беларусі», кандыдат філалагічных навук (г. Мінск, Беларусь)

## Рэгіянальная каляндарная спадчына — патэнцыяльны рэсурс Нацыянальнага Інвентара нематэрыяльнай культурнай спадчыны, беларускай культуры і адукацыі



Сучасная сацыякультурная рэальнасць з'яўляецца сферай асаблівай увагі як з боку кіраўніцтва рэспублікі, якое фарміруе культурную палітыку, так і з боку беларускага грамадства, стваральніка, носьбіта і спажыўца культуры, а таксама міжнароднай супольнасці.

Далучанасць нашай краіны да Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1972) дазволіла ўключыць у Спіс міжнароднай спадчыны ўнікальныя нацыянальныя аб'екты: Белавежскую пушчу, буйнейшы масіў рэліктавага лесу ў Цэнтральнай Еўропе з разнастайным жывёльным светам; Замкавы комплекс «Мір», адно з прыгажэйшых абарончых збудаванняў Еўропы пачатку XVI ст.; велічны архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы; пункты геадэзічнай Дугі Струве, якая ў свой час злучыла 265 пунктаў у дзесяці краінах свету.

З 18 сакавіка 2007 г. у краіне ўступіла ў сілу Канвенцыя аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення (2005). Ратыфікаваўшы Канвенцыю, Беларусь узяла на сябе абавязкі захоўваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яе палажэнні, якія выкладзены ў яе прэамбуле, усведамляючы, што культурная разнастайнасць стварае багаты і шматлікі свет, які пашырае дыяпазон выбару і забяспечвае асяроддзе для чалавечых магчымасцей і каштоўнасцей. Тым самым краіна пацвердзіла сваю прыхільнасць да дэмакратычных прынцыпаў развіцця і ўзяла кірунак ажыццяўляць культурную палітыку ў адпаведнасці з яе асноўнымі палажэннямі і прынцыпамі, гарантаваць правы для ўсіх суб'ектаў культурнай дзейнасці на культурнае самавыяўленне.

Беларусь ратыфікавала ў ліку першых дзесяці дзяржаў Міжнародную Канвенцыю аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2003). Далучэнне да Канвенцыі — важны для краіны крок усведамлення значнасці фальклорнай спадчыны ў якасці крыніцы культурнай разнастайнасці і гарантыі ўстойлівага развіцця; прызнання таго, што працэсы глабалізацыі і сацыяльных пераўтварэнняў, ствараючы ўмовы для аднаўлення дыялогу паміж супольнасцямі, разам з тым з'яўляюцца крыніцамі пагрозы.



Сёння ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь — 75 элементаў (з іх 49 гербаў і 26 традыцый), у Нацыянальным Інвентары нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі — больш за паўсотні. Каляндарная вусная народная творчасць — даволі багатая ў нашай краіне, лічыцца найбольш старажытнай па паходжанню, мае глыбокую гістарычную памяць. З усяго разнастайнага багацця каляндарнай абраднасці і іншых каляндарных традыцый узяты пад ахову з 2004 г. два дзясяткі аб'ектаў: «Калядныя цары» (в. Семежава Капыльскага р-на); «Куры» (Клічаўскі р-н); «Шчадрэц» (в. Рог Салігорскага р-на); «Жаніцьба Цярэшкі» (Каляды, в. Аношкі Лепельскага р-на); «Цягнуць Каляду на дуба» (в. Новіны Бярэзінскага р-на); «Пахаванне дзеда» (Масленічны тыдзень, Гарадоцкі р-н); «Стрылка» (Вялікдзень, в. Бездзеж Драгічынскага р-на); шанаванне Святога каменя (Вялікдзень, Сёмуха, в. Крамянец Лагойскага р-на); «Намскі Вялікдзень» (в. Аброва Івацэвіцкага р-на); «Тураўскі карагод» (в. Пагост Жыткавіцкага р-на); «Юр'я» (в. Ахонава Дзятлаўскага р-на); «Будслаўскі фэст» (в. Будслаў Мядзельскага р-на); «Ваджэнне і пахаванне стралы» (Ушэсце, в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на); перанос свячы (в. Наваселле Бярэзінскага р-на); «Кусты» (другі дзень Тройцы, аг. Лобча Лунінецкага р-на); «Провады русалкі» (заканчэнне Русальнага тыдня, в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на); «Бразгун» (в. Наркі Чэрыкаўскага р-на); паломніцтва і пакланенне «Блакітнай крыніцы» (в. Кліны Слаўгарадскага р-на); «Міхайлаўская свяча» (аг. Вяляцічы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Барысаўскага р-на); «Варварынская свяча» (в. Басценавічы Мсціслаўскага р-на).

Аналіз Спісу паказвае, што ўзята пад ахову толькі частка сапраўды багатай нематэрыяльнай спадчыны беларускага народа. З зімовага цыкла ў ахоўным рэестры не прадстаўлены шматлікія традыцыі: трох куццяў, разнастайнасць калядных абходаў з ваджэннямі «казы» і іншых тэатральных персанажаў і сродкаў («звязда»), батлейкавыя, грамнічныя (стрэчанскія), масленічныя, гульнёва-харэаграфічныя і інш. Чакаецца, што вясновы каляндар Нацыянальнага Інвентара нематэрыяльнай культурнай спадчыны папоўніцца рэгіянальнымі фальклорна-этнаграфічнымі адзінкамі, у тым ліку, святкавання Дабравешчання (Благавешчання), Вялікадня, разнастайнымі праявамі гукання вясны, Саракоў, Аўдоцці Вясноўкі разам з унікальным валачобніцтвам, Радаўніцы, Сёмухі і інш. Тое ж адносіцца да летняга і восеньскага перыядаў.

У апошнія гады звернута ўвага на фальклярызаваныя традыцыі, звязаныя з міфалогіяй, са светапоглядам, рэлігіяй — пакланенне крыніцам, крыжам, ушанаванне абразоў, правядзенне брацкіх свечак і інш. Пачатак зроблены, зафіксавана некалькі элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, але тут таксама патрабуецца клапатлівая праца па ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі праяў традыцыйнай культуры. 

Экспедыцыйныя палявыя запісы супрацоўнікаў Інстытута праблем культуры (сёння — Інстытут культуры Беларусі) пры падтрымцы ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў, вынікам якіх стаў выпуск грунтоўнай працы «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» [2], аўтарыскладальнікі якіх сёлета адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, сведчаць, што многія цікавыя і нават унікальныя каляндарна-фальклорныя традыцыі не толькі застаюцца ў памяці старажылаў, але і знаходзяцца ў жывым бытаванні.

Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя — спосаб актуалізацыі і першая ступень у працэсе захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Інстытутам культуры Беларусі створаны Нацыянальны Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі з дапамогай кансультатыўнай і фінансавай падтрымцы ЮНЕСКА: гэта база даных і сайт www.livingheritage.by. Інвентар пастаянна папаўняецца новымі элементамі.

У рамках праекта інвентарызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі Інстытутам культуры Беларусі падрыхтавана выданне «Жывая спадчына» [1], якое ўтрымлівае найбольш выразныя яе элементы ў розных катэгорыях бытавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ад аўтэнтычных выканаўцаў, мясцовых супольнасцей, работнікаў культуры залежыць захаванне, падтрымка, адраджэнне элементаў нематэрыяльнай спадчыны з мэтай узнаўлення і пашырэння культурнай разнастайнасці, сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў.

Важнейшым элементам захавання традыцыйнай спадчыны з'яўляецца не толькі яе дакументаванне, але і даследаванне, папулярызацыя, перадача і вывучэнне пры дапамозе фармальнай і нефармальнай адукацыі.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Жывая спадчына Беларусі. Нацыянальны Інвертар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі : Каталог / уклад. Т. М. Мармыш. — Мінск : Інбелкульт, 2015.

2. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. — Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе / аўт. кал. : Т. Б. Варфаламеева (навук. кір. і скл.). — Мінск : Бел. навука, 2001. — 790 с.; Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. — Т. 2 : Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.]. — Мінск : Бел. навука, 2004. — 910 с.; Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. — Т. 3 : Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; аўт. ідэі Т. Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. — Мінск : Выш. шк., 2006. — 608 с.; Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. — Т. 4 : Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. — Мінск : Выш. шк., 2008. — 559 с.; Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. — Т. 5 : Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. — Мінск : Выш. шк., 2010. — 847 с.; Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. — Т. 6 : Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн. 1 / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. — Мінск : Выш. шк., 2012. — 910 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ